Источник: "Звязда" - 2014-04-22

# КОНКУРС ДЛЯ МАЛАДЫХ НАВУКОЎЦАЎ

## Аб'яўлены рэспубліканскі конкурс для назначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным на 2015 год

**Указам Прэзідэнта заснаваны 100 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, якія працуюць у арганізацыях, што займаюцца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, сацыяльных і гуманітарных навук. Стыпендыі прызначаюцца тэрмінам на адзін каляндарны год у памеры, які ўстанаўліваецца Прэзідэнтам на падставе прапаноў спецыяльна створанай Міжведамаснай камісіі.**

Для ўдзелу ў конкурсе вылучаюцца кандыдатуры, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у навуковай, навукова-тэхнічнай інавацыйнай дзейнасці. Пры гэтым дактары навук павінны быць ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдаты навук — да 35 гадоў, вучоныя без ступені — да 30 гадоў на 1 студзеня года, у якім ажыццяўляецца вылучэнне.

Вылучаюць кандыдатуры арганізацыі па асноўным месцы працы таленавітага маладога вучонага, на сходзе навуковых работнікаў або навукова-тэхнічным (вучоным) савеце на падставе рэкамендацыі калектыву работнікаў структурнага падраздзялення, дзе ён працуе.

Арганізацыі, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, прадстаўляюць па кожнай з іх хадайніцтва.

Дакументы прадстаўляюцца **да 1 ліпеня 2014 года** ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных арганізацыямі акадэміі; у Міністэрства адукацыі Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных установамі вышэйшай адукацыі; у Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных іншымі арганізацыямі, якія займаюцца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі.

Стыпендыі не назначаюцца маладым навукоўцам, якім у папярэднія пяць гадоў, уключаючы год, у якім ажыццяўляецца вылучэнне для ўдзелу ў конкурсе, прызначаліся стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам; тым, каму на год прызначэння стыпендыі прадастаўляюцца гранты ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 13 верасня 2013 года № 425; тым, каму на працягу трох гадоў, што папярэднічалі году прызначэння стыпендыі, прызначаліся іншыя стыпендыі Прэзідэнта, за выключэннем стыпендый і грантаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, таленавітай моладзі.

З поўнай інфармацыяй аб парадку правядзення конкурсу, умовах, устаноўленых для дасягненняў таленавітых маладых вучоных, пералікам прадстаўляемых дакументаў можна азнаёміцца на сайце Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь **http://gknt.org.by**

**Святлана БУСЬКО**.

Святлана Бусько. Конкурс для маладых навукоўцаў